# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2(60) 2009**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**

## Змест

***Галоўны рэдактар***

**П.Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

В.В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л.М. Давыдзенка
А.В. Данільчанка
А.П. Жытко
М.М. Забаўскі
Л.М. Каранеўская (*адк. сакратар*)
І.В. Катляроў
П.В. Кікель
Г.А. Космач
Н.І. Кунгурава
А.М. Люты
У.А. Мельнік
А.І. Смолік
С.В. Снапкоўская
А.С. Цернавы
В.В. Шынкароў

### *Гісторыя*

*Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў*

*Жылінскі М.Г.* Дзейнасць партызан і падпольшчыкаў Беларусі па зрыве германскіх планаў у галіне адукацыі ... 4

*Бязлепкін Я.П.* Палітыка германскіх акупантаў у сферы адукацыі і культуры на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. (па матэрыялах англа-амерыканскай гістарыяграфіі) ... 15

*Скок В.П.* Амерыканская зона акупацыі Германіі: адміністрацыя і кіраванне. 1945–1949 гг. ... 18

*Варывончык І.В.* ЗША ў Другой сусветнай вайне: праблемы ўнутранага развіцця ... 21

*Талкачоў А.В.* Палітыка Вялікабрытаніі па германскім пытанні ў 1957–1959 гг. ... 25

✧ ✧ ✧

*Якаўчук В.І.* Фарміраванне дзяржаўнага апарату ў заходніх губернях Расійскай імперыі ў XIX – пачатку XX ст. ... 29

*Клепікаў М.Я.* Захаванне культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі ў пачатку 20-х гг. XX ст. ... 33

*Цуба М.В.* Грамадска-палітычныя накірункі дзейнасці эсэраўскіх арганізацый у Беларусі падчас Першай сусветнай вайны (жнівень 1914 – люты 1917 г.) ... 37

*Лютая А.Э.* Працы айчынных даследчыкаў па гістарыяграфіі сацыяльна- эканамічнай гісторыі Беларусі другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. ... 40

*Драздова К.А.* Роля і месца банкаў у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1861–1914 гг.) ... 44

### *Філасофія*

*Малчанаў П.Ю.* Сацыякультурныя ўмовы фарміравання сінергетыкі як агульнанавуковага метаду даследавання ... 49

### *Паліталогія*

*Зенчанка В.А.*, *Сарокін А.А.* Феномен таталітарызму і сучаснасць ... 53

*Цыганоў А.Р.*, *Падкапаеў В.В.* Беларуска-кітайскае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва: вопыт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і асноўныя напрамкі развіцця ... 57

*Кізіма С.А.* Заходні глабалізацыйны праект: патэнцыял і перспектывы ажыццяўлення ... 62

*Дзмітрук Ю.У.* Некаторыя аспекты стану рэлігійнасці ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь ... 65

### *Сацыялогія*

*Кунгурава Н.І.*, *Цо Лінь.* Сацыяльная работа ў Кітаі: асаблівасці фарміравання ... 70

*Раманава С.П.* Развіццё брытанскай сацыялогіі: 100 гадоў гісторыі ... 71
*Мясаедаў А.М.* Прафесійная культура ўрача і аксіялогія крайніх межаў чалавечага існавання ... 75

### *Эканоміка*

*Давыдзенка Л.М., Максімчук А.І.* Еўрапейская эканамічная інтэграцыя як фактар развіцця адносін добрасуседства ... 79
*Лазарук А.У.* Выкарыстанне механізмаў вытворчай кааперацыі ў развіцці гаспадарчых сувязей паміж прамысловымі прадпрыемствамі ... 83
*Лю Цзэпін.* Рэформа сельскай гаспадаркі ў Кітаі і яе ўздзеянне на эканамічнае развіццё краіны ... 87

### *Культуралогія*

*Чарняўская, Ю.В.* Этнічная карціна свету: структура і функцыі ... 93
*Красюк У.Ф.* Інфармацыйнае грамадства і віртуалізацыя культуры ... 96
*Банцэвіч П.К.* Актуалізацыя біблейскіх матываў у творчасці У. Караткевіча: культуралагічны аспект ... 99
*Захарына Ю.Ю.* Праблема стылявой ідэнтыфікацыі архітэктуры апошняй чвэрці XX – XXI ст. ... 102
**Рэфераты** ... 106

***Адрас рэдакцыі:***
220007, Мінск,
вул. Магілёўская, 37,
пакой 124,
тэл. 219-78-12
*e-mail*: vesti@bspu.unibel.by

Пасведчанне № 2288
ад 08.02.05.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Падпісана ў друк 12.06.09
Фармат 60×84 1/8.
Папера афсетная.
Гарнітура *Арыял*.
Друк Riso.
Ум. друк. арк. 12,32.
Ул.-выд. арк. 14,31.
Тыраж 100 экз.
Заказ 278.

*Выдавец*
*і паліграфічнае выкананне:*
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны
педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка».
Ліцэнзія № 02330/0494368
ад 16.03.09.
Ліцэнзія № 02330/0494171
ад 03.04.09.
220050, Мінск, Савецкая, 18.
*e-mail*: izdat@bspu.unibel.by

*За дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары*

*Рэдактар*
Л. М. Каранеўская

*Тэхнічнае рэдагаванне*
І. І. Галіцкага

*Камп'ютэрная вёрстка*
І. І. Галіцкага

© Весці БДПУ. Серыя 2. 2009. № 2

УДК 947.6 «1914/1917»

**М.В. Цуба,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ПДУ г. Пінск*

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ЭСЭРАЎСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЖНІВЕНЬ 1914 – ЛЮТЫ 1917 г.)

Першая сусветная вайна была часам грандыёзных перамен у гісторыі ўсяго чалавецтва. Уцягнутыя ў гэту вайну розныя грамадска-палітычныя сілы з'яўляліся своеасаблівым дэтанатарам сацыяльных выбухаў і ўзрушэнняў. Разам з гэтым мяняліся падыходы і накірункі дзейнасці партыйных арганізацый. Яны імкнуліся прыстасавацца да ўмоў вайны, выжыць і праводзіць далей мэтанакіраваную працу.

Вывучэнне эвалюцыі дзейнасці партыйных арганізацый на беларускіх землях падчас Першай сусветнай вайны мае прынцыпова важнае значэнне для паглыблення ведаў, светапогляду аб сутнасці грамадска-палітычных змяненняў у той перыяд і сёння. Абумоўлена гэта не толькі зацікаўленасцю ў грамадстве да падзей мінулага, але і падабенствам некаторых рыс грамадска-палітычных умоў: існаванне шматпартыйнасці, істотная палітычная актыўнасць у грамадскім жыцці, суіснаванне на беларускіх землях розных нацыянальных таварыстваў, суполак, зямляцтваў, пошукі ўсталявання сваіх ідэалагічных канцэпцый на аснове менталітэту народаў, якія пражываюць у Беларусі і г. д.

Літаратура і крыніцы па пытаннях вышэйакрэсленай праблематыкі ў Беларусі падчас Першай сусветнай вайны сведчаць аб тым, што гісторыкамі зроблены пэўны крок наперад у вывучэнні дзейнасці партыйных арганізацый. Асабліва значныя зрухі адбыліся на сучасным этапе. Апублікаваныя новыя дакументальныя матэрыялы садзейнічалі аб'ектыўнаму раскрыццю гісторыі грамадска-палітычных адносін, дзейнасці палітычных партый у тым ліку і эсэраўскіх партыйных арганізацый (Бригадин П.И. «Эсеры в Беларуси» (конец XIX в – февраль 1917 г.) – Мінск: «Згода», 1994. – 152 с.).

Аднак, нягледзячы на з'яўленне прыкметных, значных даследаванняў, усё ж неабходна заўважыць, што перыяд жнівень 1914 – люты 1917 гг. у гісторыі грамадска-палітычных арганізацый з'яўляецца найменш распрацаваным і асветленым.

Падзеі ў пачатку Першай сусветнай вайны і ўцягванне ў яе ўсё новых дзяржаў развіваліся так хутка, што засталі ў значнай ступені знянацку сацыял-дэмакратычныя партыі, арганізацыі і рухі. Гэтым можна растлумачыць, што ўнутры адных і тых жа партый існавалі далёка неадназначныя падыходы да вайны і часта супрацьлеглыя думкі, не мяркуючы ўжо аб поглядах і адносінах асобных партый да гэтай падзеі паміж сабой. Складанасць становішча аказалася вышэй за свядомасць многіх сацыял-дэмакратычных дзеячаў, а таму было шмат розных меркаванняў.

Тым часам, пакуль многія партыі і рухі высвятлялі свае адносіны да вайны і часта канфліктавалі паміж сабой, урад праявіў у дадзены момант небывалую актыўнасць. Скончыўшы мабілізацыю, ён адразу распачаў рэпрэсіі супраць «унутранага ворага». Да таго ж у прыфран-

тавой Беларусі знайсці падставу для гэтага было няцяжка. У загадзе галоўнакамандуючага Паўночна-Заходнім фронтам, накіраваным у пачатку вайны з г. Ліды да камандуючых армій гэтага фронту, было напісана: «Начальнік штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага паведаміў мне, што з дэпартамента паліцыі паступаюць звесткі, у якіх прыводзяцца даныя аб намерах сацыял-дэмакратычных партый распачаць стачачны рух. Узнікненне ўнутраных беспарадкаў можа вельмі сур'ёзна адбіцца на поспеху нашых ваенных аперацый» [1]. І ў разасланым па беларускіх губернях, якія знаходзіліся на ваенным становішчы, 28 жніўня 1914 г. іменным высачайшым указам даводзілася да ведама, што «галоўныя начальнікі такіх мясцовасцей, у сілу п. 17, арт. 19 правіл ваеннага становішча, маюць права высылаць недабранадзейных асоб ва ўнутраныя губерні імперыі, з апавяшчэннем аб чым Міністра Унутраных Спраў для ўстанаўлення за імі паліцэйскага надзору» [2].

На беларускіх землях, якія ўваходзілі ў прыфрантавую паласу, размах рэпрэсій супраць дзеячаў сацыял-дэмакратычнага руху набыў больш значныя памеры, чым у астатніх рэгіёнах Расійскай імперыі. У выніку з больш-менш настроеных апазіцыйна да ўрада сацыял-дэмакратычных партый і рухаў засталіся толькі асобныя рэшткі арганізацый, якія належалі да той ці іншай партыі, былі адарванымі ад арганізаванага руху і па-свойму трактавалі самыя розныя пытанні, што датычыліся вайны.

Рознымі і супярэчлівымі былі адносіны да вайны ўнутры партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР). На сваёй нарадзе ў жніўні 1914 г. у Швейцарыі лідэры эсэраўскіх арганізацый зрабілі спробу вызначыцца па гэтым пытанні. Але рознагалоссі набылі настолькі супярэчлівы характар, што погляды і меркаванні лідэраў ПСР у дачыненні да вайны фактычна распаліся на некалькі накірункаў.

Левая групоўка гэтай партыі (эсэры-інтэрнацыялісты) на чале з Б. Камковым і М. Натансанам у сваіх перакананнях салідарызавалася з бальшавікамі. Эсэры-інтэрнацыялісты выступалі за працяг барацьбы з самадзяржаўем у ваенны час і лічылі, што паражэнне Расійскай імперыі ў вайне дапаможа перамагчы рэвалюцыі.

Наадварот, правая групоўка ПСР на чале з М. Аўксенцьевым выступала з пазіцый блізкіх да кадэтаў – за падтрымку ўрада ў вайне да пераможнага канца, абвясціўшы лозунг: «Спачатку перамога, затым рэвалюцыя!» [3, с. 140–141].

Яшчэ адна групоўка (кіраўнікі А. Кубаў і І. Рубановіч) увогуле адмаўляла імперыялістычны характар вайны з боку краін Антанты, пры гэтым заяўляла, што перамога над аўстрагерманскім блокам умацуе еўрапейскую дэмакратыю і з'явіцца зыходным пунктам для барацьбы мас супраць мілітарызму [3, с. 142].

Але найбольш шматлікай і ўплывовай у ПСР была лінія цэнтрыстаў. Менавіта групоўка цэнтрыстаў, з аднаго боку, адмоўна аднеслася да лозунга «правых» эсэраў – вядзенне вайны да пераможнага канца, што перашкаджала б выхаду краіны з вайны. А з іншага, крытыкуючы несправядлівы характар вайны, прызнавала неабходнасць удзелу ў абароне сваёй краіны ад знешняй агрэсіі. Гэта пазіцыя была выкладзена лідэрам цэнтрыстаў В. Чарновым на канферэнцыі сацыялістычных сіл краін Антанты ў лютым 1915 г. У прыватнасці, у дэкларацыі адзначалася, што «канферэнцыя павінна рашуча адмежавацца ад усялякіх спроб ідэалізацыі вайны і надзей на тое, што перамога ў ёй аднаго з ваюючых бакоў выканае таксама задачы, вырашэння якіх да гэтай вайны мы чакалі ад унутраных перамог сацыялізму і працоўнай дэмакратыі» [3, с. 141].

У беларускіх губернях пасля ўвядзення ваеннага становішча, якое дало магчымасць паліцыі і ваенным уладам арыштоўваць і высылаць за межы гэтых губерняў пад надзор паліцыі масы людзей «за шкодную для дзяржаўнага парадку і грамадскага спакою дзейнасць» [4], было вельмі цяжка праводзіць якую-небудзь рэвалюцыйную працу.

Але каб выжыць, захавацца ў дадзеных умовах, некаторыя магчымасці для апазіцыйных да ўрада сацыял-дэмакратычных груп і арганізацый усё ж існавалі. Маюцца пэўныя звесткі аб дзейнасці партыі эсэраў у Беларусі ў гэты час. Так, у дакладзе памочніка начальніка Магілёўскага жандарскага ўпраўлення падпалкоўніка Кармілёва (снежань 1914 г.) паведамляецца, што ў Гомелі праводзіўся збор грошай для выплаты абаронцам па справе разгромленай паліцыяй у пачатку вайны Палескай арганізацыі РСДРП і «ў гэтым зборы грошай прымалі актыўны ўдзел сацыялісты-рэвалюцыянеры (эсэры), і члены партыі Бунд» [5]. У наступнай справаздачы дакументы той жа жандармерыі сведчаць, што «з мабілізацыяй у снежні 1914 г. на вайсковую службу былага сакратара Гомельскага камітэта сацыялістаў-рэвалюцыянераў Аляксандра Дана, які стаяў на чале арганізацыі, дзейнасць партыі амаль поўнасцю спынілася» [6]. Аднак хутчэй за ўсё жандармерыя ў дадзенай справаздачы выказала жадаемае за сапраўднае. Бо ў паведамленні паліцыі «Аб становішчы работы да 1 мая 1915 года ў Гомельскай арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў» сказана, што «Гомельская і Нава-Беліцкая (прадмесце г. Гомеля) групы партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, якія маюць свае асобныя арганізацыі, аб'ядноўваюцца ў Гомельскім камітэце партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Гомельскі камітэт уваходзіць у склад Кіеўскага аб'ядна-

нага камітэта, ад якога атрымлівае кіруючыя ўказанні», далей адзначаецца, што «Гомельскі камітэт, хаця і робіць спробы арганізаваць у паветах партыйныя групы, так званыя пярвічныя арганізацыйныя ячэйкі, але пакуль што гэтыя спробы не ўвянчаліся поспехам» [7].

Сваю рэвалюцыйную працу падчас вайны эсэры праводзілі, як і раней, абапіраючыся ў аснове на агітацыйную дзейнасць сярод сялянства. Яны працягвалі прапагандаваць лозунг «сацыялізацыі» зямлі, які меркавалі ажыццявіць у пасляваенны час. Прычым «сацыялізацыю» – ураўнаванне карыстання зямлёй, згодна са сваімі праграмнымі дакументамі, імкнуліся рэалізаваць не рэвалюцыйным шляхам, а з дапамогай рэформ і тэрарыстычных актаў. Акрамя таго, даказваючы цэласнасць і непарыўнасць сувязей працоўнага люду, яны выступалі супраць правядзення класавай грані паміж сялянамі і рабочымі [8, с. 12].

У некаторых выпадках эсэраўскія арганізацыі ў Беларусі вымушаны былі ўвогуле спыніць апазіцыйную да ўрада дзейнасць і ў адпаведнасці з абставінамі мяняць напрамак сваёй працы. У пачатку лютага 1915 г. адбыўся сход членаў Віцебскага камітэта партыі эсэраў. Пры абмеркаванні на гэтым сходзе пытання: «Ці падыходзіць сённяшні момант для пачатку рэвалюцыйнай агітацыі ў Віцебскай губерні?». Многія з удзельнікаў сходу выказаліся супраць разгортвання якой-небудзь рэвалюцыйнай барацьбы і не прынялі ніякага рашэння па вынесеным на разгляд пытанні [9].

За спыненне рэвалюцыйнай дзейнасці ў масах выказалася ў гэты час і Магілёўская арганізацыя ПСР [3, с. 142]. Імкнучыся хоць у нейкай ступені аблегчыць цяжар вайны, які зваліўся ў першую чаргу на працоўныя масы, асобныя эсэраўскія арганізацыі сканцэнтроўвалі сваю дзейнасць у сельскагаспадарчых, спажывецкіх кааператывах, крэдытных таварыствах і розных дабрачынных арганізацыях. Аднак такая работа насіла не толькі высакародны характар, але з'яўлялася і фактарам падтрымкі ўрада.

Мала надавалася ўвагі з боку ПСР на арганізацыю супольнай дзейнасці з іншымі партыямі левага накірунку, у чым праяўлялася празмерная амбіцыйнасць. Так, у праграме ПСР лічылася, што «толькі яна (ПСР), а не якая-небудзь іншая партыя заклікана да ажыццяўлення вышэйшых сацыяльных ідэй» [10]. У выніку, ва ўспамінах Антона Луцкевіча пазначаецца, што «між расейскімі партыямі сацыял-дэмакратаў і сацыял-рэвалюцыянераў заўсёды ішла адкрытая барацьба. Абодва канкурэнты пры гэтым так падбухторвалі супраць адзін аднаго работнікаў таго і іншага кірунку, што тыя гатовыя былі часам адны адным горла перарэзаць перш, чым выступіць супраць царскае ўлады» [11, с. 17].

Каб неяк зменшыць рознагалоссі левых сіл і выправіць у гэтым плане становішча, летам 1915 г. у Маскве і Петраградзе адбыліся нарады народніцкіх партый, дзе прымалі ўдзел прадстаўнікі самых розных гарадоў Расійскай імперыі з мэтай фарміравання блока рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл [3, с. 145].

Аднак у Беларусі па-ранейшаму ў эсэраўскіх радах не было ў той час ні згоды, ні адзінства. Прадстаўнікі правага крыла ПСР разам з меншавікамі падтрымалі і прынялі ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў рабочых груп пры ваенна-прамысловых камітэтах (ВПК), а прадстаўнікі левага эсэраўскага крыла разам з бальшавікамі іх байкатавалі. Гэта з'явілася адной з падстаў меркаваць, што дадзеныя выбары ў беларускіх губернях амаль зусім не праводзіліся [12, с. 616].

У другой палове 1915 г. намецілася пэўнае збліжэнне поглядаў па самых розных палітычных пытаннях эсэраў і меншавікоў, што прывяло ў верасні 1915 г. да правядзення аб'яднанай эсэра-меншавіцкай канферэнцыі. Яна зацвердзіла сваім афіцыйным органам штотыднёвую газету «Призыв», а яе рэдактарамі – эсэраў Аўксенцьева, Бунакава, Арунава, а таксама меншавікоў Пляханава і Аксельрода. Акрамя таго, канферэнцыя прыняла зварот «Да свядомага працоўнага насельніцтва Расіі», дзе расійскі народ заклікаўся да абароны Айчыны і адказу ад рэвалюцыйнага «ўспышкапускальніцтва». Прычым аўтары звароту дапускалі магчымасць звяржэння царскага ўрада, але як умову выратавання Расійскай імперыі ад германскай небяспекі [3, с. 145–146]. Вядомыя факты сведчаць, што лістоўкі з дадзеным зваротам распаўсюджваліся і ў прыфрантавой Беларусі [12, с. 594].

Пад уплывам канферэнцыі праводзіў сваю работу ў нашым краі «Ваенна-рэвалюцыйны саюз», які быў створаны эсэрамі заходніх губерняў у пачатку вайны з мэтай больш плённай дзейнасці ў арганізацыях, што абслугоўвалі фронт. Гэты саюз на сваёй нарадзе, што адбылася ў 1916 г., заклікаў «устрымацца ад друкавання і распаўсюджвання рэвалюцыйных праккламацый», каб «не выклікаць узмацнення рэпрэсій з боку царскіх улад» [8, с. 210]. У той жа час у эсэраўскіх лістоўках, якія распаўсюджваліся па Магілёўскай губерні, паведамлялася, што «інтарэсы» дэмакратыі і ўлік суадносін працы і капіталу ў свеце вядуць нас да прыняцця гэтай вайны і мы не можам не жадаць паражэння ваенных сіл германцаў [12, с. 594].

У другой палове 1916 г. узмацніліся хвалянні салдацкіх мас. У гэтых умовах ПСР значна актывізавала сваю дзейнасць сярод салдат. Эсэраўскія актывісты прынялі ўдзел у падзеях 27 лютага 1917 г. у Петраградзе.

Менавіта прадстаўнікі эсэраў, меншавікоў і бальшавікоў сфарміравалі Петраградскі Савет.

А пры пераўтварэнні Саветаў рабочых дэпутатаў у Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў пазіцыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў яшчэ больш узмацніліся [3, с. 147]. Чаго, аднак, нельга сказаць аб Мінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў, дзе не было з-за «... неарганізаванасці, разгубленасці і дэзарыентацыі, даволі моцных на фронце прадстаўнікоў сацыялістаў-рэвалюцыянераў на чале з пазней вядомым кіраўніком камітэта Устаноўчага сходу Несцеравым» [13, с. 114].

У цэлым жа падчас Першай сусветнай вайны нешматлікія і разрозненыя арганізацыі і групы ПСР на беларускіх землях па магчымасці імкнуліся ахапіць сваім уплывам самыя розныя слаі насельніцтва, у першую чаргу сялян і салдат. Яны спадзяваліся выкарыстаць яго ў барацьбе з самадзяржаўем пасля вайны. Аднак у перыяд ваенных дзеянняў прытрымліваліся ў асноўным тактыкі «абаронства», адказаўшыся ад актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы з урадам.

### Літаратура і крыніцы


1. НА РБ. – Фонд. 295. – Воп. 1. – Спр. 8591б. – Л. 246.
2. НА РБ. – Фонд. 2499. – Воп. 1. – Спр. 26. – Л. 20.
3. *Бригадин, П.И.* Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917 г.) / П.И. Бригадин. – Мн.: «Згода», 1994. – 152 с.
4. НА РБ. – Фонд. 705. – Воп. 1. – Спр. 15. – Л. 346–347.
5. НА РБ. – Фонд. 60. – Воп. 3. – Спр. 113. – Л. 1.
6. НА РБ. – Фонд. 60. – Воп. 3. – Спр. 113. – Л. 24.
7. НА РБ. – Фонд. 60. – Воп. 3. – Спр. 113. – Л. 23.
8. *Липинский, Л.П., Лукьянов, Е.П.* Крестьянское движение в Белоруссии в период между двумя революциями (июнь 1907 – февраль 1917 г.) / Л.П. Липинский, Е.П. Лукьянов. – Минск: Наука и техника, 1964. – 258 с.
9. НА РБ. – Фонд. 1430. – Воп. 1. – Спр. 49. – Л. 2.
10. НА РБ. – Фонд. 705. – Воп. 2. – Спр. 8. – Л. 267.
11. *Луцкевіч, А.* За дваццаць пяць гадоў (1903–1928). Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная Грамада. Беларуская сацыялістычная Грамада. – Мінск: БелЭН, 1991. – 64 с.
12. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917гг.). – 688 с.
13. *Кнорин, В.Г.* Избранные статьи и речи / В.Г. Кнорин. – Мн.: Беларусь, 1990. – 303 с.



### Summary

*Peculiarities and activity trends of Socialist Revolutionary organizations in Belarus from the beginning of World War I to the February Revolution of 1917 are investigated. Much attention is paid to the conditions and circumstances which took place during the war on the Belarusian territory and exerted much influence on the activities of Socialist Revolutionary parties.*